USAID
FROM THE AMERICAN PEOPLE

# 2013 ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - БЕЛАРУСЬ




## УСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.7




У 2013 годзе палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя варункі заставаліся стабільнымі ў Беларусі. Беларускія ўлады не прадпрымалі намаганняў па лібералізацыі грамадства, але і не ўзмацнялі рэпрэсіі ў краіне. Палітычныя вязні застаюцца галоўнай перашкодай да паўнавартаснага дыялогу паміж Беларуссю з аднаго боку і Еўрапейскім Звязам і з ЗША з другога.

Спробы арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГС) удзельнічаць у публічнай палітыцы сустракалі збольшага варожае стаўленне з боку ўлады. Аднак, у адрозненне ад папярэдніх гадоў, у 2013 годзе з'явіліся паспяховыя прыклады адвакацыі з боку АГС, якія прывялі да заканадаўчых зменаў. Сеткі развівалі свой патэнцыял і адыгрывалі ключавую ролю ў прасоўванні грамадска значных інтарэсаў. Разам з тым прававое поле па-ранейшаму заставалася неспрыяльным для дзейнасці арганізацый трэцяга сектару. АГС працавалі ў накірунку мабілізацыі рэсурсаў з розных крыніцаў, у тым ліку за кошт дабрачынных ахвяраванняў і продажу паслугаў.

Паводле звестак на 31 снежня 2013 года, у краіне налічваліся 2,521 зарэгістраванае грамадскае аб'яднанне, з іх 231 міжнароднае, 694 рэспубліканскіх і 1,596 мясцовых; зарэгістраваныя і пастаўленыя на ўлік 38,915 арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў. У ліку зарэгістраваных таксама 31 саюз (асацыяцыя) грамадскіх аб'яднанняў; 145 фондаў (14 міжнародных, 5 рэспубліканскіх і 126 мясцовых); 37 прафесійных саюзаў і 23,193 прафсаюзныя арганізацыі. Дзейнасць АГС пашыраецца на тэрыторыю ўсёй краіны, але ў асноўным сканцэнтравана ў вялікіх гарадах. У 2013 годзе было зарэгістравана 70 новых АГС, у тым ліку 2 праваабарончыя арганізацыі; справаздачны год адзначыўся найменшай колькасцю зарэгістраваных за год арганізацый, пачынаючы з 2005 года.

Адказваючы на неспрыяльны прававы асяродак і рызыку крымінальнай адказнасці за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, беларускія АГС усё часцей рэгіструюцца ў іншых краінах, да прыкладу, Польшчы і Літве, ці ў іншых арганізацыйна-прававых формах. Шэраг ініцыятываў застаюцца незарэгістраванымі, нягледзячы на нелегальнасць такога віду дзейнасці. Можна сцвярджаць, што колькасць зарэгістраваных у краіне АГС не адлюстроўвае рэальную колькасць АГС, актыўных у краіне.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 6.8




Нягледзячы на прыняцце шэрагу заканадаўчых актаў, датычных дзейнасці АГС, у 2013 годзе прававы асяродак не палепшыўся і заставаўся даволі неспрыяльным.

2 кастрычніка 2013 года быў прыняты Закон, які ўнёс змены ў рэгуляванне дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў. У прыватнасці, быў скарочаны спіс дакументаў, неабходных для рэгістрацыі; зменшаныя патрабаванні да тэрытарыяльнага прадстаўніцтва заснавальнікаў рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый; удакладненыя некаторыя пытанні датычна рэгістрацыі міжнародных грамадскіх аб'яднанняў і іх структур. Закон таксама ўвёў норму, паводле якой арганізацыя можа быць ліквідаваная, калі цягам трох год не падае штогадовую справаздачу пра сваю дзейнасць у рэгіструючыя органы.

Па-ранейшаму заканадаўства ўтрымлівае значныя перашкоды для ўтварэння і дзейнасці АГС. Дзяржава пакідае за сабой права адвольна адмовіць у рэгістрацыі і перыядычна гэта практыкуе.

Да прыкладу, арганізацыі “Маладыя дэмакраты”, “Гавары праўду” і “За справядлівыя выбары” неаднаразова атрымлівалі адмову ў рэгістрацыі з розных тэхнічных прычынаў.

У 2013 годзе МГА “Добрая воля” была ліквідаваная па рашэнні Вярхоўнага Суда за парушэнне заканадаўства, у прыватнасці за тое, што арганізацыя не падала справаздачу за 1999 год і выкарыстоўвала абрэвіятуру назвы на капэртах для афіцыйных лістоў. Дзейнасць незарэгістраваных арганізацый застаецца нелегальнай; па-ранейшаму існуюць абмежаванні на атрыманне беларускага і замежнага фінансавання, у тым ліку на ананімныя ахвяраванні.

Прыняты ў студзені 2013 года Дэкрэт Прэзідэнта №2 увёў абмежаванні для асобаў, якія знаходзяцца на прафілактычным уліку ў КДБ ці пракуратуры. У прыватнасці, асобы са спісу не маюць права выступаць у якасці дырэктароў установаў ці кіраўнікоў саюзаў юрыдычных асобаў.

1 студзеня 2013 года новая версія Закона “Аб сацыяльным абслугоўванні” ўвайшла ў сілу. Асобны раздзел закона па сацыяльнай замове дае права зарэгістраваным АГС удзельнічаць у конкурсах на атрыманне дзяржаўнага фінансавання.

Юрыдычны адрас арганізацыі павінен знаходзіцца ў нежылым памяшканні, што патрабуе ад АГС арандаваць офісы і адпаведна накладае значныя фінансавыя выдаткі. Дзяржава дае ў арэнду свае памяшканні па ільготнай стаўцы для абраных АГС. У красавіку ўрад амаль удвая скасаваў спіс АГС, якія мелі права арандаваць офісы з ільготнай зніжкай; 256 арганізацый былі выключаны са спісу і цяпер вымушаныя плаціць за арэнду ў 10 разоў болей. АГС таксама маюць рызыку атрымаць адмову ў выкарыстанні памяшканняў для правядзення сваіх мерапрыемстваў. Арандуючы памяшканне для мерапрыемстваў, АГС, як правіла, павінны прадастаўляць спіс удзельнікаў і падрабязную праграму ўласнікам памяшкання, якія, у сваю чаргу, мусяць гэта зацвярджаць у кантралюючых і праваахоўных органах.

Пачынаючы з 2001 года, АГС павінны рэгістраваць замежнае фінансаванне пры Савеце Міністраў ці ў Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці Упраўлення справамі Прэзідэнта. У рэгістрацыі можа быць адмоўлена, калі запланаваная дзейнасць не адпавядае прыярытэтам краіны. У 2011 годзе ўрад увёў санкцыі за парушэнне правіл атрымання замежнай бязвыплатнай дапамогі і ў 2013 годзе ўпершыню ўжыў іх. Кіраўніца грамадскай ініцыятывы пенсіянераў “Нашае пакаленне” была аштрафаваная нібыта за атрыманне замежнага фінансавання “ў палітычных мэтах”. Алесь Бяляцкі, лідэр Праваабарончага цэнтра “Вясна” знаходзіўся за кратамі па абвінавачванні ў тым, што не сплочваў падаткі з замежных грантаў, атрыманых праз банкі Літвы і Польшчы.

Індывідуальныя і карпаратыўныя донары атрымліваюць падаткавыя ільготы толькі тады, калі ахвяруюць на спартовыя арганізацыі ці асацыяцыі асобаў з абмежаванымі магчымасцямі. АГС маюць ільготнае падаткаабкладанне на мясцовыя ахвяраванні толькі ў асобных выпадках – для ухваленых урадам грантаў і сяброўскіх унёскаў. Тыя АГС, якія маюць права займацца гаспадарчай дзейнасцю, сплочваюць падаткі ў такіх жа памерах, як і камерцыйныя кампаніі.

Пачынаючы з вясны 2013 года, пракуратура і КДБ папярэдзілі як найменш 4 актывісты за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. У чэрвені 2013 года ў Шчучыне была ўзбуджаная крымінальная справа супраць кіраўніка незарэгістраванага дабрачыннага прытулка, аднак абвінавачванні былі скасаваныя пасля таго, як арганізацыя зарэгістравалася ў форме некамерцыйнай установы.

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ: 5.1




АГС рэгулярна праводзяць ацэнку патрэбаў сваіх мэтавых аўдыторый і развіваюць паслугі на падставе вызначаных патрэбаў. У той жа час абмежаваныя рэсурсы не дазваляюць АГС нарошчваць аб'ём запатрабаваных паслугаў. Дагэтуль даволі рэдкімі застаюцца выпадкі, калі АГС уцягваюць у сваю дзейнасць вялікую колькасць людзей. У 2013 годзе выклікі датычна пабудовы АЭС і асушэння балот стымулявалі беларусаў далучацца да экалагічнага руху, але АГС не здолелі арганізаваць усіх зацікаўленых. Толькі адзінкавыя АГС, да прыкладу, арганізацыі супраць хатняга гвалту, шэраг культурных праектаў кшталту Мова ці Кава, Джазавыя суботы у Мінску, а таксама Універсітэт залатога веку для сталых людзей, зацікавілі вялікую колькасць прыхільнікаў.

Стратэгічнае планаванне з'яўляецца дзейсным інструментам пераважна для вялікіх АГС і сетак, якія валодаюць прафесійнымі кампетэнцыямі і механізмамі кантролю і маніторынгу. Згодна ацэнцы экспертаў, з тых АГС, якія маюць стратэгічныя планы, каля 90% адхіляюцца ад распрацаваных планаў ці не выконваюць іх цалкам.

За выключэннем сетак, большасць АГС не дбаюць пра падзел улады ўнутры арганізацыі паміж кіруючымі і выканаўчымі органамі. Звычайна адна і тая ж група лідэраў працуе і ў Радзе дырэктароў, і ў штаце арганізацыі.

АГС імкнуцца мець кваліфікаваны персанал, але нерэгулярнае фінансаванне не дазваляе гэта ажыццяўляць на сталай аснове. Адпаведна спецыялісты працуюць па розных арганізацыях, якія маюць магчымасць іх утрымліваць. Існыя інструкцыі працоўных абавязкаў часта не адпавядаюць актуальнай загружанасці. Як правіла, толькі ў вялікіх міжнародных праектах АГС маюць магчымаць кіравацца кадравымі палітыкамі і сістэмным менеджментам. АГС рэгулярна карыстаюцца прафесійнымі паслугамі юрыстаў, бухгалтараў і IT спецыялістаў, калі не маюць у штаце персанал з такімі кампетэнцыямі.

Шэраг арганізацый выконваюць арганізацыйна-каардынуючую ролю ў аказанні паслугаў арганізацыйнага развіцця іншым АГС – да прыкладу, інфармацыйна-асветніцкая ўстанова "Новая Еўразія", Біржа арганізацыйнага развіцця, міжнародны кансорцыум "ЕўраБеларусь", Рэгіянальны экалагічны цэнтр, Беларуская нацыянальная моладзевая РАДА.

Рэсурсы АГС дазваляюць мець сучаснае кампутарнае абсталяванне. Часта для арганізацыйных мэтаў выкарыстоўваецца асабістая тэхніка сябраў АГС. Адзінкавыя АГС маюць ліцэнзаванае

праграмнае забеспячэнне. Блізу 97% АГС маюць дасяг да інтэрнэту. Разам з тым, звычайна АГС не маюць прасунутых вебсайтаў, што не дазваляе насельніцтву мець поўнае ўяўленне пра трэці сектар.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6.4




Беларускія АГС імкнуцца да фінансавай незалежнасці, нягледзячы на перашкоды ў дасягу да нацыянальных, замежных і міжнародных крыніцаў. Міжнародныя донары застаюцца асноўнай крыніцай фінансавання АГС.

АГС мусяць мець дазвол на атрыманне і выкарыстанне бязвыплатнай замежнай дапамогі. У 2013 годзе Дэпартамент па гуманітарнай дапамозе Упраўлення справамі Прэзідэнта адмовіў у рэгістрацыі ўсіх праектаў (не зважаючы на іх мэты і запланаваную дзейнасць), якія павінны былі фінансавацца Праграмай малых грантаў амбасады ЗША. Крымінальнае пакаранне і іншыя захады ўжываюцца ў выпадку парушэння працэдураў па атрыманні замежнага фінансавання. Як вынік, шмат АГС рэгіструюцца за мяжой, у Літве ці Польшчы, бо замежныя АГС не мусяць справаздачыцца ў Беларусі за атрыманыя гранты.

Згодна даследаванню, якое было зроблена ў кастрычніку 2013 года Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПІ), 14,5% беларусаў дапамагалі АГС фінансава (у 2012 годзе – 13%). Цягам апошніх двух год MaeSens.by, онлайн платформа, арыентаваная на развіццё культуры дабрачыннасці, перадала каля $220,000 на адпаведныя мэты. Рэлігійныя і сацыяльныя арганізацыі, да прыкладу, Міжнародны дабрачынны фонд дапамогі дзецям “Шанс”, Міжнароднае дабрачыннае аб’яднанне “ЮніХелп” і Беларускі дзіцячы хоспіс, з’яўляюцца найбольш паспяховымі ў прыцягненні мясцовых рэсурсаў. Менш чым за пяць год Фонд “Шанс” атрымаў $2.65 мільёнаў на дапамогу дзецям. АГС нарошчваюць аб’ём сродкаў, атрыманых ад бізнес-кампаній. Так, яскравай падзеяй года стаўся конкурс сацыяльных праектаў Social Weekend, у якім бралі ўдзел каля 60 праектаў АГС, 12 з якіх атрымалі фінансаванне ад беларускіх камерцыйных арганізацый. У той жа час фактычна немагчыма зацікавіць мясцовы бізнес на падтрымку адвакатыўных, праваабарончых ці медыйных праектаў.

Толькі АГС з вялікай колькасцю сябраў, да прыкладу, прафесійныя саюзы, разглядаюць сяброўскія ўнёскі ў якасці важнай крыніцы фінансавання. Так, Незалежны прафсаюз гарнякоў збірае ад сваіх сябраў каля $40,000 штомесяц.

Беларускія АГС традыцыйна атрымліваюць падтрымку ў нематэрыяльнай форме, у тым ліку праз валанцёраў. АГС, якія працуюць са сталымі людзьмі і моладзю, каля 60% сваёй дзейнасці рэалізуюць дзякуючы валанцёрскай працы.

АГС працягваюць шукаць магчымасці атрымліваць прыбытак за кошт продажу сваіх паслугаў. Паколькі Закон “Аб грамадскіх аб’яднаннях” забараняе грамадскім арганізацыям займацца гаспадарчай дзейнасцю, АГС рэгіструюцца ў форме некамерцыйных установаў, для якіх такой забароны няма.

Нягледзячы на тое, што Закон “Аб сацыяльным абслугоўванні” ўвайшоў у сілу з 1 студзеня 2013 года, мясцовыя дзяржаўныя бюджэты ўжо былі зацверджаныя і не прадугледзелі выдаткаў для фінансавання АГС.

Беларускія АГС пачынаюць разумець неабходнасць празрыстага фінансавага менеджменту, уключна незалежнага фінансавага аўдыту і публікацыі штогадовых фінансавых справаздачаў. І хаця практыка размяшчэння публічных фінансавых справаздачаў не з’яўляецца пашыранай, штогод яна становіцца ўсё больш заўважнай. Так, Асацыяцыя “БелСетка антыСНІД” упершыню распаўсюдзіла гадавую справаздачу аб сваёй дзейнасці з фінансавым раздзелам. Праект MaeSens.by мае блог, у якім выкладаюцца навіны і дакументы з пацвярджэннем, колькі і куды былі накіраваныя сабраныя грошы.

## АДВАКАТАВАННЕ: 5.5




У 2013 годзе шэраг паспяховых адвакатыўных намаганняў АГС мелі за вынік змены ў заканадаўстве. РГА “Перспектыва”, грамадская арганізацыя па абароне правоў прадпрымальнікаў, дамаглася, каб была адкладзена рэалізацыя Тэхнічнага рэгламента Мытнага саюза (Беларусь, Казахстан, Расія), згодна якому прадукцыя лёгкай прамысловасці павінна праходзіць абавязковую сертыфікацыю. Гэта дало час прадпрымальнікам падрыхтавацца да новай складанай працэдуры. Пры падтрымцы АГС і супольнасцей грамадская кампанія “У абарону беларускіх балот” здолела дамагчыся захавання чатырох з васьмі балотаў, якім пагражала знішчэнне. Вынікам намаганняў таварыства “Зялёная сетка” ў 2013 годзе сталіся змены ў Водным і Лясным кодэксах Рэспублікі Беларусь.

Група АГС па абароне жывёлаў распачала шырокую грамадскую кампанію супраць жорсткага абыходжання з жывёламі. У выніку Генеральная пракуратура падтрымала ўвядзенне крымінальнай адказнасці за негуманнае абыходжанне з жывёламі; адпаведны законапраект плануецца разглядзець у 2015 годзе.

Як правіла, менавіта АГС з’яўляюцца ініцыятарамі ў наладжванні супрацоўніцтва з уладамі, якія ў сваю чаргу больш ахвотна працуюць з праверанымі партнёрамі ў межах “бяспечнай” сацыяльнай праблематыкі. На мясцовым узроўні АГС маюць доўгатэрміновыя стасункі з уладамі ў сацыяльнай сферы і развіцці мясцовых супольнасцей. Да прыкладу, ГА “Сяльчанка”, група жанчын, якія выступаюць за паляпшэнне якасці жыцця ў сельскай мясцовасці, маюць падтрымку ад мясцовых выканаўчых органаў улады. Ёсць і адваротныя выпадкі, калі мясцовыя

ўлады не прыслухоўваюцца да голасу АГС, як, да прыкладу, у Гомелі, дзе намаганні мясцовых актывістаў па захаванні драўлянай архітэктуры горада практычна не мелі станоўчага выніку.

Дзяржаўныя інстытуцыі на нацыяльным і мясцовым узроўнях стварылі мноства Грамадскіх радаў для таго, каб улічваць думку грамадскасці пры прыняцці рашэнняў. Міністэрствы дэманструюць розную ступень супрацоўніцтва з АГС: так, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродку Рэспублікі Беларусь даволі інтэнсіўна працуе з экалагічнымі АГС, у тым ліку ў фармаце Грамадска-кансультатыўнай рады. У той жа час Міністэрства ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь не ўключыла ў сваю Грамадскую раду ніводнага прадстаўніка АГС. Частка Грамадскіх радаў існуюць толькі на паперы.

Даволі вялікая група беларускіх АГС працягвае ўдзельнічаць ва "Усходнім Партнёрстве" і "Еўрапейскім дыялогу па мадэрнізацыі" з мэтай уплыву на сацыяльна-палітычныя працэсы і рэформы ў краіне. Аднак афіцыйны Мінск адмаўляецца браць удзел у названых ініцыятывах.

У снежні 2013 года (упершыню пасля 2011 года) адбыліся публічныя пратэсты супраць увядзення транспартнай пошліны для фізічных і юрыдычных асобаў. У сацыяльных сетках цягам некалькі дзён было сабрана каля 80,000 подпісаў за скасаванне падатку. І хаця ўрад не адмяніў сваё рашэнне, але пратэсты змусілі чыноўнікаў даваць больш адкрытую інфармацыю па падаткавым новаўвядзенні.

Цягам 2013 года АГС таксама працягвалі доўгатэрміновыя адвакатыўныя кампаніі. Офіс па правах людзей з інваліднасцю распачаў новы этап у межах кампаніі "Даступнасць" з мэтай уплыву на дзяржаўныя праграмы і пераарыентацыі іх на нормы Канвенцыі аб правах інвалідаў. Кампанія "Будзьма беларусамі!" распачала шэраг новых ініцыятываў кшталту ток-шоў, кірмашы праектаў для папулярызацыі нацыяльнай культуры і мовы.

Намаганні па адвакатаванні заканадаўства датычна дзейнасці АГС па-ранейшаму застаюцца непаспяховымі. У кастрычніку 2013 года Парламент прыняў змены ў законы, якія рэгулююць дзейнасць АГС; пры гэтым думка саміх АГС не была ўлічаная. Цэнтр прававой трансфармацыі Lawtrend супольна з Асамблеяй няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі спрабавалі ўплываць на заканадаўчы працэс, дасылаючы ў афіцыйныя органы адпаведныя прапановы і арганізуючы публічныя слуханні. Аднак дэпутаты не ўзялі да ўліку меркаванне АГС.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.3




АГС аказваюць паслугі ў сферы адукацыі, аховы здароўя, абароны правоў чалавека, аховы акаляючага асяродку, культуры і адпачынку, правоў меншасцяў, спорту і турызму. Паслугі ажыццяўляюцца ў выглядзе кансультацый, трэнінгаў, даследаванняў, сацыяльнай дапамогі як насельніцтву, так і дзяржаўным, недзяржаўным і міжнародным арганізацыям. Назіраецца

тэндэнцыя, што АГС усё больш арыентуюць свае паслугі на патрэбы кліентаў і патрабаванні, якія паўстаюць пры ацэнцы патрэбаў.

У 2013 годзе Беларуская асацыяцыя журналістаў стварыла сацыяльную сетку, якая дазваляе камунікаваць журналістам-фрылансерам з іншымі журналістамі і выдаўцамі. МГА “Гендэрныя перспектывы”, Беларуская асацыяцыя маладых хрысціянскіх жанчын і іх партнёры ўпершыню распрацавалі стандарты якасці сацыяльных паслугаў для грамадскіх арганізацый, якія працуюць у сферы супрацьдзеяння хатняму гвалту і папярэджання гандлю людзьмі.

Даследаванні і агляды, якія ажыццяўляюцца Міжнародным кансорцыумам “ЕўраБеларусь”, Цэнтрам прававых трансфармацый Lawtrend, Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў (БІСС), Даследчым цэнтрам Інстытута прыватызацыі і менеджменту і іншымі арганізацыямі, усё больш становяцца пашыранымі і ахопліваюць значны спектр пытанняў і рэгіёнаў. Міжнародныя донары і арганізацыі карыстаюцца вынікамі даследаванняў і кансультацыямі ад беларускіх АГС для таго, каб вызначаць прыярытэты і распрацоўваць праграмы развіцця ў Беларусі. У 2013 годзе асветніцкая ўстанова “Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый” апублікавала аналітычны дакумент “Стан грамадзянскай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь”. Згодна даследаванню, блізу 40 беларускіх АГС аказваюць паслугі ў сферы грамадзянскай адукацыі і спрабуюць наладжваць супрацоўніцтва з дзяржаўнай сістэмай адукацыі, вынікі якога пакуль аднак нельга назваць паспяховымі.

АГС намагаюцца зрабіць свае паслугі ўстойлівымі. Так, Лятучы універсітэт, Універсітэт залатога веку, а таксама АГС, зарэгістраваныя ў форме ўстановаў, просяць сваіх кліентаў часткова пакрываць кошт адукацыйных паслугаў.

Дзяржаўныя органы паступова пачынаюць прызнаваць неабходнасць АГС у аказанні сацыяльных паслугаў. Да прыкладу, 18 прадстаўнікоў АГС былі ўключаныя ў рэгіянальныя каманды па маніторынгу і ацэнцы дзейнасці ў сферы ВІЧ/СНІДа.

Закон “Аб сацыяльным абслугоўванні” ад 1 студзеня 2013 года дазваляе дзяржаве фінансаваць сацыяльныя паслугі і праекты АГС. Прыняцце Закона не паспела за зацвярджэннем мясцовых бюджэтаў, якія адпаведна ў 2013 годзе не ўключылі выдаткі на сацыяльную замову. Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарвыканкама правёў шэраг кансультацый з АГС па планаванні гарадскога бюджэта на 2014 год ужо з улікам сацыяльнай замовы. 18 АГС з Мінску падрыхтавалі апісанне і падрабязную калькуляцыю сваіх сацыяльных паслугаў і праектаў. Мясцовыя ўлады Салігорску таксама правялі падобныя кансультацыі.

У ліку 16 дзіцячых і моладзевых арганізацый, якія ўключаны ў Рэспубліканскі рэестр і фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэта, знаходзяцца толькі прадзяржаўныя арганізацыі кшталту Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі (БРСМ) і Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі. Астатнія профільныя арганізацыі могуць звяртацца за дзяржаўнай падтрымкай у межах конкурсаў, якія ладзяцца Упраўленнем па справах моладзі пры Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь. Фінансаванне абраных арганізацый не з’яўляецца публічнай інфармацыяй.

## ІНФРАСТРУКТУРА: 5.2




Шэраг праграмаў і інстытуцый у краіне аказваюць усебаковую падтрымку АГС, у тым ліку праз фінансаванне малых праектаў, кансультацыі, інфармацыйныя паслугі, трэнінгі. Большасць з такіх структур працуюць супольна з міжнароднымі і беларускімі арганізацыямі. Да прыкладу, міжнародны кансорцыум “ЕўраБеларусь” і Форум Syd размяркоўвалі фінансаванне ад SIDA, АГА “Фонд ім. Льва Сапегі” і Асацыяцыя агенцый лакальнай дэмакратыі ALDA падтрымлівалі праекты, скіраваныя на актывізацыю грамадзянаў у мясцовым самакіраванні і развіцці мясцовых супольнасцей. Рашэнні па фінансаванні прымаюцца пры актыўным удзеле прадстаўнікоў АГС; пашыраецца практыка ўтварэння Назіральных радаў па распрацоўцы стратэгіяў праграмаў развіцця.

Сеткі АГС – таварыства “Зялёная сетка”, Асацыяцыя “БелСетка антыСНІД”, Беларуская нацыяльная моладзевая РАДА, нефармальная асацыяцыя арганізацый для людзей з інваліднасцю – актыўна нарошчваюць свой патэнцыял. Фармальныя і нефармальныя сеткі аказваюць інфармацыйную, адукацыйную і адвакатыўную дапамогу сябрам сваіх сетак. На Экафоруме ў кастрычніку 2013 года экалагічныя АГС здолелі дамовіцца пра 8 найбольш актуальных выклікаў, якія стаяць сёння перад краінай у сферы экалогіі. Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі, якая была заснаваная ў 1997 годзе з мэтай развіцця дэмакратычнай прававой дзяржавы, павялічыла свой склад з 250 да 327 АГС-сябраў.

АГС у Мінску і іншых рэгіёнах Беларусі, у тым ліку асветніцкая ўстанова “Офіс еўрапейскай экспертызы і камунікацый”, Цэнтр эфектыўных камунікацый “Фідбэк”, міжнародны кансорцыум “ЕўраБеларусь”, аказваюць інфармацыйныя і трэнінгавыя паслугі ў сферы праектнага менеджменту, арганізацыйнага развіцця, міжнароднага супрацоўніцтва і напісання праектных заявак. Большасць трэнінгаў бясплатныя для ўдзельнікаў. Біржа арганізацыйнага развіцця з’яўляецца інфармацыйна-метадычным рэсурсам, механізмам для каардынацыі паміж правайдарамі паслугаў і АГС, а таксама інструментам развіцця прафесійнай супольнасці кансультантаў-трэнераў; вебсайт Біржы ўтрымлівае інфармацыю пра больш чым 100 кансультантаў і трэнераў і 100 АГС, якія шукаюць падтрымку ў арганізацыйным развіцці. У трэцім сектары па-ранейшаму назіраецца попыт на экспертныя паслугі ў сферы стратэгічнага планавання, праектнага і праграмнага менеджменту, сувязяў з грамадскасцю, арганізацыйнага брэндзінгу.

У 2013 годзе АГС ажыццявілі шэраг паспяховых акцый супольна з бізнесам і ўладамі. Міжнародны сацыяльна-эканамічны Фонд “Ідэя” арганізаваў маштабны Джазавы фестываль у Мінску ў партнёрстве з камерцыйнымі кампаніямі і гарадскімі ўладамі. Мінскае роварнае таварыства працуе супольна з Мінскім гарвыканкамам па распрацоўцы праграмы стымулявання роварнага руху ў сталіцы. У пачатку года паміж МГА “Разуменне” і Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь была падпісаная дамова аб супрацоўніцтве

па рэалізацыі нацыянальнага плана абароны дзяцей на 2012-2016 гг. Тым не менш выпадкі супрацы трэцяга сектара з іншымі сектарамі пакуль маюць лакальны і эпізадычны характар.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.9




У 2013 годзе значных зменаў у грамадскім іміджы АГС не адбылося. АГС часта ўспрымаюцца як палітызаваныя ці як дабрачынныя.

Улады час ад часу супрацоўнічаюць з АГС, калі такое патрабаванне зыходзіць ад міжнародных донараў і праграмаў, але працягваюць ставіцца да АГС з высокай ступенню падазронасці і недаверу. Прэзідэнт умацоўвае негатыўны імідж незалежных АГС – у папярэднія гады ён ужываў да арганізацый цэтлік “бандыты”, цяпер называе іх “пятай калонай”, якая разбурае нацыю знутры.

Большасць грамадзянаў не разумее ці не прызнае тэрмін “грамадзянская супольнасць” і не ведае, якую ролю адыгрывае сектар у развіцці краіны. Згодна сацыялагічнаму даследаванню НІСЭПІ у кастрычніку 2013 года, 21,2% рэспандэнтаў нічога не ведаюць пра АГС, у той час як 30,3% рэспандэнтаў бралі ўдзел у дзейнасці АГС ці атрымлівалі паслугі ад АГС. Прыблізна траціна беларусаў (32,8%) сцвярджаюць, што яны давяраюць АГС, недавер выказваюць 18,2%. Палітычныя партыі і рухі маюць самы нізкі ўзровень даверу – толькі 11,7% рэспандэнтаў давяраюць палітычным арганізацыям, у той час як 40,1% кажуць пра адваротнае стаўленне.

Асвятленне дзейнасці АГС у медыя заўважна не палепшылася, нягледзячы на тое што кантакты АГС з медыя няўхільна пашыраюцца. Згодна даследаванню Беларускай асацыяцыі журналістаў, праведзенага ў пачатку года, былі вызначаныя лепшыя прэс-службы АГС, якія сістэмна камунікуюць з журналістамі; сярод іх – Праваабарончы цэнтр “Вясна”, рух “Гавары праўду”, Нацыянальная платформа Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга Партнёрства і таварыства “Зялёная сетка”. Зыходзячы з колькасці выступаў у СМІ, папулярны сайт TUT.BY назваў кіраўніцу МГА “Гендэрныя перспектывы” сярод медыя-персонаў года.

Экспертыза з боку АГС у СМІ запатрабаваная, але па даволі вузкім спектры тэмаў кшталту дзеці, хатні гвалт, людзі з інваліднасцю. БелСАТ з’яўляецца адзіным тэлеканалам, які актыўна запрашае беларускіх грамадскіх лідэраў і экспертаў у свае праграмы, тым самым прэзентуючы альтэрнатыўны пункт гледжання на пытаннях развіцця эканомікі, палітыкі, экалогіі і грамадзянскай супольнасці. Праўда, аўдыторыя канала, які знаходзіцца ў Польшчы, з’яўляецца абмежаванай (600,000 гледачоў) у параўнанні з беларускімі дзяржаўнымі тэлеканаламі, аўдыторыя якіх сягае блізу 99% насельніцтва.

АГС працягваюць інтэнсіўна выкарыстоўваць інтэрнет для сувязяў з грамадскасцю. Усе папулярныя сайты байнета маюць раздзел “Грамадства”, дзе часта размяшчаецца інфармацыя

пра дзейнасць АГС. Аднак толькі адзінкавыя арганізацыі актыўна займаюцца сувязямі з грамадскасцю і працуюць з медыя на рэгулярнай аснове.

Бізнес паступова пачынае дэманстраваць лепшае ўспрыняцце і падтрымку праграмаў АГС. Так, мабільны аператар МТС удзельнічаў у праграме Мінскага універсітэта залатога веку "Інтэрнету ўсе ўзросты падуладныя". Фонд "Шанс", які дапамагае хворым дзецям, актыўна падтрымліваецца мясцовым бізнесам. Фэст экскурсаводаў – маштабнае мерапрыемства, калі прафесійныя гіды і аматары робяць бясплатныя туры па гарадах і мястэчках Беларусі, - ажыццяўляецца ў партнёрстве з некалькімі турыстычнымі фірмамі.

АГС па-ранейшаму дэманструюць абмежаваную празрыстаць сваёй дзейнасці, часткова засцерагаючыся наступстваў рэпрэсіўнага заканадаўства. Толькі адзінкавыя АГС маюць этычныя кодэксы. Колькасць АГС, якія публікуюць гадавыя справаздачы, павялічваецца. У 2013 годзе Асацыяцыя "БелСетка антыСНІД" распаўсюдзіла сваю першую гадавую справаздачу, якая ўключыла ў сябе справаздачы ўсіх 16 сябраў сеткі – практычна ўсяго сектара ВІЧ-сервісных арганізацый.

Індэкс устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГСІУ) з'яўляецца ключавым інструментам вымярэння праграэсу грамадскага сектара ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе і Еўразіі (E&E рэгіён). Індэкс вывучае варункі, якія спрыяюць развіццю грамадзянскай супольнасці, з фокусам на прававы асяродак для дзейнасці няўрадавых арганізацый, арганізацыйнае развіццё, фінансавую ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктуру і грамадскі імідж. Кожнае вымярэнне рэйтынгуецца паводле сямібальнай шкалы, дзе 1 паказвае на вельмі прагрэсіўны ўзровень, а 7 – на нізкі ўзровень развіцця. Індэкс распрацаваны Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці ў партнёрстве з мясцовымі арганізацыямі ў кожнай з тых краін, дзе вымяраецца Індэкс.

Для атрымання падрабязнай інфармацыі, калі ласка, звяртайцеся ў Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб'яднанне "АКТ", actngo.info@gmail.com

Англійская версія Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці 2013 для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі даступная для азнаямлення па спасылцы: http://www.usaid.gov/europe-eurasia-civil-society